Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі

“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт

імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Кантрольныя працы

## для студэнтаў 3 курса дзённай і завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі

Метадычныя рэкамендацыі па дысцыпліне “Беларуская мова”

для спецыяльнасці:

1-01 01 01 Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск

2018

**Кантрольная праца па тэмах “Прыслоўе”, “Службовыя часціны мовы”, “Словазлучэнне”.**

**Мэта**. Праверыць лінгвістычную і маўленчую кампетэнцыю студэнтаў, іх уменне карыстацца набытымі ведамі.

**В а р ы я н т 1.**

**Заданне 1.**Спішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне прыслоўяў.

Стаялі (з)боку, (з)боку вакзала; расце (у)высь, (у)высь блакітную;бегчы (на)ўздагон, выцерці (на)суха, вывучыць (на)памяць, размаўляць (па)беларуску, зрабіць перш (на)перш, ісці (па)ціху, (з)лёгку стаміцца, вымак (да)шчэнту.

**Заданне 2**. Спішыце, вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы і зрабіце іх марфалагічны разбор.

1.Кузьма доўна не верыў, **ці** праўду я кажу, ці жартую (Пестр.). 2. **Ці** не будзе і сягоння навальніцы? (К-с).3. **Хай** сабе стаяць на зямлі і яны, змрочныя балады Міра, Наваградка, Ліды (Каратк.).

**Заданне 3**. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Болен гриппом, видел своими глазами, писать по адресу, у ребёнка болит живот, два долгих года, читать про себя, в двух шагах от дома, смеяться над другом, ходить по коридорам, пойти в лес за грибами, определить по вкусу, благодарить родителей.

**В а р ы я н т 2.**

**Заданне 1.** Спішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне прыслоўяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(У)трох пакоях, працавалі (у)трох; (з)большага пабелены, (з)большага вядра; рабіць (па)новаму, замяло (на)глуха, вывучыць (як)след, азірацца (раз)(по)раз, зрабіць (па)людску, схапіць (на)ляту, чорны (з/с)(пад)нізу, (на)пярэдадні свята.

**Заданне 2**. Спішыце, вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы і зрабіце іх марфалагічны разбор.

1.Васіль пра ўсё расказвае так, **нібы** справа гэтая самая звычайная (І.Н.). 2. Кветкі **нібы** спыняліся на яе берагах, адкрываючы люстэрка чыстай бліскучай вады (Каратк.). 3. Туманная імгла ў хмарным небе слалася нізка, **амаль** чапляючыся за пагорак (В.Б.).

**Заданне 3**. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Сбегать за учебником, смеяться про себя, шуточки надо мной, похож на брата, жить с родителями, заведующий садом, квартира с тремя комнатами, не пришёл из-за тебя, плакать о нем, в другой раз, смотреть за старенькой мамой, извините, пожалуйста, меня.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## **В а р ы я н т 3.**

**Заданне 1.** Спішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне прыслоўяў.

Глядзець (з)верху, (з)верху дуба; (з)вечара да раніцы, працавалі (з)вечара; бегчы (на)выперадкі, зрабіць (з/с)(пад)цішка, хадзіць (абы)дзе, бегчы (без)аглядкі, крыкнуў (на)хаду, зрабіць (па)гаспадарску, задумаўся (міма)волі, было не (да)смеху.

**Заданне 2**. Спішыце, вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы і зрабіце іх марфалагічны разбор.

1.Іван разумеў, што лепей было б яму парваць з бацькам, пайсці на свой хлеб, як-небудзь пражыў **бы**, але на **гэта** не хапала адвагі (В.Б.) 2. Для этнографа паганства **– гэта** сапраўды пережытак, рарытэт на фоне сучаснага жыцця (Стр.). Пасля “Пана Тадэвуша” Адам Міцкевіч **амаль** не займаўся паэзіяй (К.Т.).

**Заданне 3**. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Дом в два этажа, расказывать об отце, споткнуться о пень, ухаживать за больным братом, простить ему всё, удивляться результатам, приехать через год, сбегать за хлебом, не спать по ночам, жениться на однокласнице, всё в пользу Отчизне, писать по адресу.

## **В а р ы я н т 4.**

**Заданне 1.** Спішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне прыслоўяў.

(З)усім класам, (з)усім не вывучыў; выставіць (на)паказ, (на)паказ мадэлей; глянуў (з/с)(пад)ілба, ведаў (з)малку, паехаць (да)дому, цямнела (па)крысе, прайшло само (па)сабе, зрабіў не (па)мойму, разлічыцца (па)батальённа, мяняцца (на)вачах.

**Заданне 2**. Спішыце, вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы і зрабіце іх марфалагічны разбор.

1.Дзесяць год назад чалавек нават не думаў, што зноў **хоць** калі-небудзь прыйдзе сюды (Сач.). 2. Ёсць непаўторная паэзія ў асеннім полі, **хоць** на першы позірк здаецца яно пустое і панурае (Шам.). 3. Пясок за дзень нагрэўся на сонцы, **аж** боязна ў яго ступаць босымі нагамі (Сач.).

**Заданне 3**. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

В пяти километрах от города, два раза в месяц, похожий на меня, ходить за водой, увидеть сквозь туман, слышать своими ушами, заведующий кафедрой, жить с мамой, простите меня, отблагодарить соседей, смореть за детьми, умиляться младенцу.

## **В а р ы я н т 5.**

**Заданне 1.** Спішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне прыслоўяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(У)глыб лесу, нырнуль (у)глыб; імкнуцца (да)волі, чакаў (да)волі доўга; не (з)рукі, (па)маленьку, (па)дзіцячы, забіць (на)глуха, (з)лёгку стаміцца, адчынены (на)сцеж, чытаць (у)голас, узяў (пад)пахі.

**Заданне 2**. Спішыце, вызначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы і зрабіце іх марфалагічны разбор.

1.Запаветную хату з белымі аканіцамі мы пазналі здалёк, **нават** не давялося пытаць нікога (Каратк.). 2. Мужчына распраўляў разгорнутыя крыльцы матылёў, нават **не гледзячы**, што робяць ягоныя рукі (Каратк.). 3. А ён (Аўсееў) урэшце памкнецца асядлаць свой лёс, заслужыць, даказаць сваё права на людское жыццё, якога ён варты, **нягледзячы** ні на якія няўдачы (В.Б.).

**Заданне 3**. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Прийти после обеда, два раза в день, муж старше жены, у меня болит голова, грустить о доме, поехать к брату, 3:0 в пользу "Динамо", прочитайте про себя, пушествовать па странам Европы, домик с двумя комнатами, издеваться над недостатками, сходить в лес за малиной.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В а р ы я н т 6.**

**Заданне 1.** Спішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі. Растлумачце напісанне прыслоўяў.

(У)пачатку семестра, зрабілі (у)пачатку; стаяць (з)боку, (з)боку на бок; удаўся (на)славу, (з)нарок не прыдумаеш, (да)зарэзу патрэбна, гаварыць (за)вочы, жыць (па)суседску, усё(такі) прыйшоў, прышпіліць (з/с)(пад)ыспаду, адказваць (па)чарзе.

**Заданне 2**. Спішыце, вызначце, якой часцінай мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы і зрабіце іх марфалагічны разбор.

1.**Як** пякельна доўга цягнецца дзень! (В.Б.) 2. Поўня паменшала, пабялела, зрабілася ядранай і **аж** засвяціла, **як** удзень сонца (Пташ.) 3. Тонкія бярозкі на фоне сасонак **як** белыя ніткі, спушчаныя з белага неба на зямлю (Парх.).

**Заданне 3**. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Опоздал из-за тебя, хочу отблагодарить вас, отправили по адресу, у меня зуб болит, не беспокойся о нем, удивляться фактам, послать за врачом, в следующий раз, жить со старшим братом, смеяться над неудачами, не хуже других, смех сквозь слезы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Кантрольная праца па тэме “Сінтаксіс”**

**Мэта**. Праверыць лінгвістычную і маўленчую кампетэнцыю студэнтаў, іх уменне карыстацца набытымі ведамі.

**В а р ы я н т 1.**

**Заданне 1**. Спішыце сказ, растаўляючы знакі прыпынку. Вызначце від сказа, складзіце яго схему і пісьмова растлумачце знакі прыпынку.

У радасці і ў журбе з блізкіх і длёкіх дарог я вяртаюся зноў і зноў туды дзе сярод старых лясоў і вялізных неабсяжных балот на пясчанай выспе раскінулася вёска у якой я нарадзіўся у якой і сёння жыве мая маці у якой жывуць мае браты (Б.Сачанка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В а р ы я н т 2.**

**Заданне 1**. Спішыце сказ, растаўляючы знакі прыпынку. Вызначце від сказа, складзіце яго схему і пісьмова растлумачце знакі прыпынку.

З першага дня мацярынства трывог і пакут болей чым радасцей у кожнай маці пакаўзнулася дзіцятка разбіла носік матчына сэрца ледзь не парвецца першай двойка гора для маці а яна ўсё чакае расцей і ўцех (С.Грахоўскі).

**В а р ы я н т 3.**

**Заданне 1**. Спішыце сказ, растаўляючы знакі прыпынку. Вызначце від сказа, складзіце яго схему і пісьмова растлумачце знакі прыпынку.

У Максіма Багдановіча у гэтага знанага і славутага юнака вось ужо некалькі дзесяцігоддзяў не саромеюцца вучыцца і тыя хто выдаўшы па некалькі дзясяткаў паэтычных кніжак знаходзяцца ў добрай пары сталага і

мудрага вопыту і тыя хто набыўшы яснуюі светлую разважлівасць упарта набліжаюцца да фласофскага асэнсавання жыцця і тыя хто часцей за ўсё пераросшы паэта па гадах нясмела і сарамліва збіраюць у далейшую дарогу свой неслухмяны вырай першую кніжку паэзіі (Я.Сіпакоў).

**В а р ы я н т  4.**

**Заданне 1**. Спішыце сказ, растаўляючы знакі прыпынку. Вызначце від сказа, складзіце яго схему і пісьмова растлумачце знакі прыпынку.

Адразу прыходзіць радасная прасветласць на ўсё пачынаеш глядзець інакшымі вачыма і здзіўляешся што ў гарадскім тлуме прапускаеш праходзіш міма і не заўважаеш як свежа востра-зялёна блішчыць пасля дажджу трава што несамавітая рэдзенькая бярозка якая расце пад акном гожая і зграбная і што вакол і сонца і вецер і неба… (А.Дзятлаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**В а р ы я н т  5.**

**Заданне 1**. Спішыце сказ, растаўляючы знакі прыпынку. Вызначце від сказа, складзіце яго схему і пісьмова растлумачце знакі прыпынку.

І пытаўся я ў сябе няўжо тады стагоддзі назад мае як прынята казаць малапісьменныя цёмныя продкі ведалі і разумелі што без Радзімы жыццё іх страціць сэнс і яны тут жа знікнуць бясследна растворацца ў свеце белым як той ранішні туман над лугам? (В.Гігевіч).

**В а р ы я н т  6.**

**Заданне 1**. Спішыце сказ, растаўляючы знакі прыпынку. Вызначце від сказа, складзіце яго схему і пісьмова растлумачце знакі прыпынку.

Чым болей я займаўся гісторыяй чым далей у глыбіню вякоў заглядаў тым большым смуткам поўнілася мая душа бо бачыў я і разумеў колькі здзекаў з народа было некалі колькі несправядлівасці было на зямлі нашай як

быццам у гэтым і быў найвялікшы сэнс для беларусаў выцерпець вытрымаць а там глядзіш і лягчэй будзе (В.Гігевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ